**22.** Выберыце з дадзеных толькі назоўнікі, якія абазначаюць з’явы прыроды: *1) сухавей; 2) лес; 3) туман; 4) кісларод; 5) сон.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**23.** У перакладзе з рускай мовы слова *крючок* (як дэталь адзення) – … .
**А)** брыж. **Б)** гаплік. **В)** гузік. **Г)** спражка. **Д)** манжэта.

**24.** Якія словы з дадзеных напісаны няправільна?
*1) рассадзіць; 2) рассада; 3) рассольнік; 4) рассаліць.*
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**25.** Сымонка “зашыфраваў” лічбамі ўстойлівыя спалучэнні. Вызначце выраз, які мае значэнне ‘*лёгка, без цяжкасцей*’.
**А)** 32, 12, 17, 1, 14, 1, 19, 13, 6.
**Б)** 32, 12, 9, 4, 21, 19, 10, 3, 1, 5, 1.
**В)** 21, 3, 16, 26, 28, 15, 6, 2, 1, 26, 28, 25, 29.
**Г)** 18, 1, 2, 10, 25, 29, 3, 28, 4, 13, 32, 5.
**Д)** 12, 21, 17, 10, 25, 29, 21, 9, 1, 17, 1, 19.

**26.** У 1517 годзе выйшла першая друкаваная беларуская кніга “Псалтыр”, якую Францыск Скарына выдаў … .
**А)** у Празе. **Б)** у Вільні. **В)** у Слуцку. **Г)** у Мінску. **Д)** у Полацку.

**27.** Гэты дзень тыдня ў даўнія часы лічыўся адным з найбольш спрыяльных для пачатку важных для гаспадаркі і значных у сямейным плане спраў. Лічылася, што менавіта ў гэты дзень таму, хто і выправіцца ў далёкую работу, абавязкова пашчасціць. Пра які дзень тыдня ідзе размова?
**А)** панядзелак. **Б)** аўторак. **В)** серада. **Г)** чацвер. **Д)** пятніца.

**28.** Старажытная назва літары “ф” – … .
**А)** феска. **Б)** фетр. **В)** ферт. **Г)** фестон. **Д)** фетыш.

**29.** Нашы продкі у свой час карысталіся словамі:
*1) вярста; 2) га□рнец; 3) дзесяціна; 4) фунт; 5) сажань.*
Якое слова абазначала меру зямельнай плошчы?
**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**30.** Дадзены дыялектныя словы:
*1) барабуля; 2) махнытка; 3) бульва; 4) пяток; 5) букса.*
Выберыце назвы *бульбы*.
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16
тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/
ГА «БА «Конкурс». Заказ 14. Тыраж 35300 экз. г. Мінск. 2015 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2015»

*Чацвер, 19 лютага 2015 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Колькі дзён у тыдні?
**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**2.** Якімі словамі вітаюцца пры сустрэчы са знаёмымі?
*1) “Добры дзень!”; 2) “Добры вечар!”; 3) “Як жывяце?”; 4) “Смачна есці!”.*
**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**3.** Вызначце правільны парадак слоў у загадцы:
*1) той; 2) яго; 3) хто; 4) усё; 5) поле;*
*6) насенне; 7) чорнае; 8) разумее; 9) сее; 10) белае.*
**А)** 3, 9, 10, 5, 1, 4, 6, 8, 7, 2. **Б)** 7, 6, 9, 4, 10, 5, 3, 1, 2, 8.
**В)** 10, 6, 3, 9, 2, 7, 5, 1, 8, 4. **Г)** 8, 4, 1, 3, 9, 7, 6, 2, 10, 5.
**Д)** 10, 5, 7, 6, 3, 2, 9, 1, 4, 8.

**4.** Уважліва пачытайце дадзеныя словы:
*1) карціна; 2) мадам; 3) міраж; 4) салата; 5) тапаля.*
Вызначце, у якіх прыкладах “схаваліся” імёны дзяўчынак.
**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**5.** У якіх словах, што з'яўляюцца назвамі птушак, на месцы пропуску напішаце літару ***у***?

*1) к..чка; 2) інд..к; 3) кр..мкач; 4) цецяр..к.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**6.** Якое слова з дадзеных з'яўляецца "лішнім"?

*1) маладзік; 2) серп; 3) поўня; 4) сход; 5) ветах.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**7.** Чаго жадаюць людзям, калі гавораць: *"Каб пра вас хвала па ўсім свеце гула*□"?

**А)** пажаданне поспехаў у працы. **Б)** пажаданне выканання абяцанняў.
**В)** пажаданне здароўя. **Г)** пажаданне добрай славы.
**Д)** пажаданне дастатку ў доме.

**8.** Выберыце з дадзеных прыкладаў словазлучэнні:

*1) вакол школы; 2) атрымаць паштоўку; 3) больш цікавы;*
*4) гульня ў шахматы; 5) будзем глядзець.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)**3, 5.

**9.** Падлічыце, колькі слоў ужыта ў вершаваных радках С. Грахоўскага з літарай ***г***.

*Сапраўдны друг гадамі гартаваны,*
*Гатовы засланіць і памагчы.*
*Прыходзіць у бядзе неспадзявана,*
*Як хлеб, як соль, як вогнішча ўначы.*

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 4. **Г)** 6. **Д)** 7.

**10.** Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае ўстойлівае спалучэнне слоў?

*Бабуліны зёлкі і малінавае варэнне мяне хутка* ***паставілі на ногі****.*

**А)** з'яўляецца рознымі членамі сказа. **Б)** дзейнікам.
**В)** выказнікам. **Г)** дапаўненнем. **Д)** акалічнасцю.

**11.** Дзеці падчас экскурсіі бачылі шмат раслін. Найбольш запомніліся

*1) званочак; 2) сухацвет; 3) кураслеп; 4) казялец.*

Дома ім неабходна было падабраць адпаведнікі на рускай мове:

*а) лютик; б) бессмертник; в) ветреница; г) колокольчик.*

Які варыянт правільны?

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 2-а, 3-б, 4-в, 1-г. **В)** 3-а, 2-б, 4-в, 1-г.
**Г)** 4-а, 1-б, 2-в, 3-г. **Д)** 2-а, 1-б, 4-в, 3-г.

**12.** Вучні запісвалі словы пад дыктоўку. Люда запісала *плывец, лахчына, бандэроль.* Зіна – *плывец, лагчына, бандэроль.* Змітрок – *плавец, лагчына, бандыроль.* Хто з вучняў запісаў усе словы без памылак?

**А)** усе вучні. **Б)** ніхто з вучняў. **В)** Люда. **Г)** Зіна. **Д)** Змітрок.

**13.** Якога слова не хапае ў народным выслоўі?

*З іголкі … не зробіш.*

**А)** хаты. **Б)** накавальні. **В)** бочкі. **Г)** долата. **Д)** люстэрка.

**14.** Выберыце з дадзеных слова, у якім ёсць [ш]:

*1) цяжка; 2) перапісчык; 3) аб'ездчык.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**15.** Колькі слоў у тэксце вучань напісаў няправільна?

*Над заснежаным лесам узышол полны месяц. Ён асвяціл усё навокал. Каля ельніка прабег волк. Ён рухался вельмі асцярожна і ціха. Мабыць, высочвал здабычу.*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**16.** Колькі слоў з [с] ужыта ў вершаваных радках Н. Гілевіча?

*Страціў слова, страціў спадчыннае слова –*
*Штосьці страціў у душы абавязкова…*

**А)** 5. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**17.** Пераблыталіся сказы:

*1. Яна пражыла ў хаце ўсю зіму.*
*2. Сінічка паляцела ў хату.*
*3. Сюды загнала яе сцюжа.*
*4. Гаспадар пашкадаваў птушку і адчыніў акно.*
*5. Аднойчы прыляцела сінічка да акна.*

Пастаўце сказы так, каб атрымаўся тэкст.

**А)** 1, 4, 2, 5, 3. **Б)** 2, 1, 5, 3, 4. **В)** 3, 5, 1, 4, 2.
**Г)** 4, 2, 3, 1, 5. **Д)** 5, 3, 4, 2, 1.

**18.** Вызначце з дадзеных няправільна запісаныя словазлучэнні:

*1) пісьменны адказ; 2) пісьмовы чалавек; 3) каменны дом.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**19.** У якіх сказах словы ў дужках трэба пісаць з канчаткам ***-е***?

1. Хлопчык убачыў у (неба) самалёт.
2. На ўроку вучні пісалі сачыненне па (карціна).
3. На (зямля) засталіся ляжаць каласкі.

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**20.** Словы *лайдак – гультай, дзіця – карапуз* з'яўляюцца … .

1) сінонімамі; 2) антонімамі; 3) амонімамі; 4) паронімамі.

Выберыце правільны варыянт.

**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**21.** Якія словы з дадзеных запісаны правільна?

*1) наушнікі; 2) ольха; 3) аколіца.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.